*Валянціна Новак*

*Алена Кастрыца*

*Святлана Вяргеенка*

# ПРА ЗБІРАННЕ І ВЫВУЧЭННЕ ФАЛЬКЛОРУ ВА ЎСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ «ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ»

ГДУ імя Ф. Скарыны знаходзіцца ў адным з цікавейшых рэгіёнаў Беларусі, які захаваў у найбольшай ступені архаічныя жанравыя формы абрадавага фальклору, рэшткі старажытнага міфалагічнага светапогляду беларусаў-палешукоў. Вывучэнне традыцыйнай духоўнай спадчыны асобных рэгіёнаў Беларусі, у прыватнасці Гомельскага Палесся, а таксама навукова-аб'ектыўная ацэнка і высвятленне асаблівасцей бытавання фальклорнай культуры асобных раёнаў з'яўляецца надзвычай важным для захавання, адраджэння і развіцця этнічнай культуры беларусаў. Лакальна-рэгіянальная тэхналогія вывучэння фальклору беларусаў Палесся і яго памежных раёнаў дае магчымасць пазнаёміцца з народным светапоглядам не толькі з пункту гледжання збіральнікаў-фальклардыстаў, але найперш з пункту гледжання носьбітаў – сапраўдных захавальнікаў фальклору і міфалогіі.

Праца па збіранні вуснай народнай творчасці ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны грунтуецца на канцэпцыі лакальна-рэгіянальнай стратэгіі палявых даследаванняў Гомельшчыны і мае сістэмны характар, што абумоўлена наступным:

1. падрыхтоўка праграм-апытальнікаў па розных відах вуснай народнай творчасці;
2. правядзенне індывідуальных кансультацый па методыцы збору фальклорна-этнаграфічных і міфалагічных звестак;
3. мэтаскіраванае планіраванне паслядоўнага фальклорна-этнаграфічнага абследавання геаграфічных месцаў як аб'ектаў.

Збіральніцкая работа, асновы якой у Гомельскім дзяржаўным універсітэце былі закладзены прафесарам, доктарам філалагічных навук М. М. Грынчыкам, накіравана на вывучэнне фальклорнай традыцыі Гомельшчыны. Падкрэслім, што правядзенне падобных арэалагічных даследаванняў фальклору дазваляе стварыць рэгіянальны аналітычны каталог, што, несумненна, з'явіцца асновай сур'ёзнага структурна-тыпалагічнага вывучэння асобных фальклорных жанраў і дапаможа глыбей выявіць дыялектыку суадносін такіх катэгорый, як этнічнае, рэгіянальнае, лакальнае.

Пачынаючы з 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў ГДУ імя Ф. Скарыны асабліва сур'ёзная ўвага звярталася на запіс звестак па абрадавым фальклоры (замовы, каляндарна-абрадавая паэзія, сямейна-абрадавая паэзія). З 1995 года ў змест праграмы фальклорных экспедыцый былі ўключаны таксама пытанні,

звязаныя са зборам звестак па ніжэйшай міфалогіі, жывёльным і раслінным свеце, касмагоніі, прыкметах і павер'ях і інш.

Апошнім часам распачата праца па стварэнні электроннай версіі архіва. На вялікі жаль, гэты від работы ажыццяўляецца марудна па прычыне адсутнасці штатных супрацоўнікаў у вучэбна-навуковай фальклорнай лабараторыі, пакуль яшчэ не зусім упарадкаваны ў архіве фальклорныя запісы на папяровых носьбітах. Тым не менш, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, выкладчыкі, аспіранты і студэнты філалагічнага факультэта, значную частку фальклорна-этнаграфічных і міфалагічных матэрыялаў ужо перавялі на электронныя носьбіты (звесткі па вясельнай абраднасці, замовах, прыкметах і павер'ях, каляндарна-абрадавай паэзіі, па народнай міфалогіі Гомельшчыны). Вялікая праца праводзіцца ў вучэбна-навуковай фальклорнай лабараторыі па сістэматызацыі і выданні матэрыялаў архіва як па асобных жанрах, так і ў цэлым па народнай творчасці раёнаў Гомельскай вобласці. Толькі за апошнія два гады выйшлі з друку наступныя кнігі: «На гранай нядзелі русалкі сядзелі» (2005г.), «Міфалогія беларусаў» (2005г.), «Спрадвечнай мудрасці скарбонка: сучасны стан традыцыйнай культуры г. Мазыра» (2005г.), «Спрадвечнае: фальклорны зборнік ліквідаваных у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС населеных пунктаў» (2005г.), «Народная спадчына Гомельскага раёна» (2007), «Прыкметы і павер'і Гомельшчыны» (2007г.), «Народная духоўная культура Брагіншчыны» (2007), «Лоеўшчына… Бэзавы рай, песенны край (сучасны стан традыцыйнай культуры Лоеўшчыны» (2007г.).

Матэрыялы названых зборнікаў шырока выкарыстоўваюцца як выкладчыкам-лектарам падчас знаёмства студэнцкай аўдыторыі з народным календаром беларусаў, сямейна-абрадавай паэзіяй, народнай міфалогіяй, так і самімі студэнтамі, калі ўзнікае неабходнасць зразумець, напрыклад, структуру вясельнага абраду, логіку і сістэмнасць вербальнага суправаджэння яго асобных этапаў. Добрую паслугу ў гэтых адносінах выконваюць і індывідуальна зробленыя кожным са студэнтаў у сваёй мясцовасці запісы фальклорна-этнаграфічных звестак па вясельнай абраднасці і паэзіі. Параўнанне класічнага беларускага вяселля з мясцовымі варыянтамі, апублікаванымі ў зборніку «Вяселле на Гомельшчыне» і ўласна запісанымі з вуснаў аднавяскоўцаў-інфармантаў, дае магчымасць студэнтам лепш засвоіць гэты складаны фальклорна-этнаграфічны комплекс, своеасаблівы «культурны тэкст». Выкарыстанне на практычных занятках канкрэтных аповедаў-апісанняў пра вяселле дазваляе вырашыць некалькі задач: убачыць багацце лакальных адметнасцей вясельнай абраднасці, пазнаёміцца з асаблівасцямі народнага побыту, суаднесці тэксты вясельных песень-ілюстрацый з адпаведнымі абрадавымі момантамі і вызначыць характар вясельных песень у жанравых адносінах.

Пры разглядзе лекцыйных тэм, звязаных з рознымі відамі абрадавага фальклору, акцэнтуецца ўвага на «жывых» прыкладах экспедыцыйных матэрыялаў. Напрыклад, на канкрэтных запісах даказваюцца факты полаўзроставай дыферэнцыяцыі ўдзельнікаў выканання калядных абрадаў,

вар'іраванне славянскіх формул заклікання марозу, дэманструецца багацце варыянтаў абраду «пахавання стралы» (ваджэння «сулы»), сцвярджаецца тэзіс арганічнай з'яднанасці міфалагічных уяўленняў з асобнымі структурнымі кампанентамі вясельнага і радзінна-хрэсьбінных абрадаў. Карыстаючыся апублікаванымі тэкстамі прыкмет і павер'яў Гомельшчыны, студэнты на практычных занятках лепш спасцігаюць іх жанравую спецыфіку, бо, як вядома, і ў паўсядзённым жыцці, і ў навуковым ужытку прыкметы і павер'і часта атаясамліваюць, нягледзячы на тое, што яны з'яўляюцца асобнымі фальклорнымі жанрамі. Аналізуючы ўласна запісаныя тэксты замоў, студэнты імкнуцца вылучыць у розных тэматычных групах міжфункцыянальныя і спецыяльныя матывы, а таксама вызначыць іх функцыі – сюжэтаўтваральную або структураўтваральную. Дапамагаюць канкрэтныя тэксты ў вызначэнні асноўных кампанентаў замоўных матываў і ў спасціжэнні сутнасці адлюстраваных у замовах міфалагічных уяўленняў.

На працягу першага семестра навучання студэнты па прапанаваных праграмах-апытальніках самастойна збіраюць фальклорна-этнаграфічныя звесткі ў сваёй мясцовасці, такім чынам рыхтуючыся да выканання заданняў вучэбнай фальклорнай практыкі. Дзякуючы ўласна зробленым запісам, студэнты больш глыбока асэнсоўваюць на практычных занятках структуру абрадаў, іх семантыку, сімволіку дзеянняў і прадметнай атрыбутыкі, усведамляюць сутнасць тых ці іншых з'яў, дынаміку іх бытавання і багацце мясцовай спецыфікі.

У другім семестры, слухаючы лекцыі па дысцыпліне «Славянская міфалогія», студэнты таксама выконваюць індывідуальную работу, карыстаючыся распрацаванай праграмай-апытальнікам па зборы звестак, звязаных з народнай міфалогіяй, якая, дарэчы, патрабуе ўзбагачэння фактычнай асновы сучаснымі запісамі. Сабраныя на тэрыторыі Гомельшчыны матэрыялы па народнай міфалогіі (выдадзены кнігі-хрэстаматыі «Народная міфалогія Гомельшчыны», «Міфалогія беларусаў»), з'яўляюцца надзейнай крыніцай для рэканструкцыі славянскай міфалагічнай карціны свету.

Методыка вывучэння фальклору Гомельшчыны як сістэма дазваляе распаўсюдзіць стратэгію даследавання сучаснага фальклору на розныя рэгіёны Беларусі, што дапаможа стварыць больш дакладную карціну бытавання духоўнай спадчыны беларусаў, вызначыць як шляхі яе захавання, так і аснову сучаснай культурнай палітыкі ў справе адраджэння нацыянальнай культуры.